УДК 39(476.7-89)(-22)(091)«192/198»

***Аксана Аляксандраўна Селях***
*аспірант 2-га года навучання каф. этналогіі, музеялогіі і гісторыі мастацтваў Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта*
***Oksana Selyakh***
*Post-Graduate Student of 2rd Year Study of the Department of Ethnology, Museology and Art History of the Belarusian State University*
e-mail: oxana.gugnuk@gmail.com

# ШТОДЗЁННАЕ ЖЫЦЦЁ СЕЛЬСКІХ ДЗЯЎЧАТ ЗАХОДНЯГА ПАЛЕССЯ ў 20-я – 80-я гг. ХХ ст. ЯК ДАСЛЕДЧАЯ ПРАБЛЕМА

*Артыкул прысвечаны асэнсаванню штодзённага жыцця сельскіх дзяўчат Заходняга Палесся ў 20-я – 80-я гг. ХХ ст. як даследчай праблемы. Вызначана месца ў сучасным беларускім навуковым дыскурсе даследаванняў штодзённага жыцця і гісторыі дзявочай штодзённасці. Зроблена выснова аб павышанай цікавасці сярод прадстаўнікоў айчыннай акадэмічнай навукі да гісторыі штодзённасці і разам з тым аб адсутнасці комплексных даследаванняў паўсядзённых практык і «структур штодзённасці» прадстаўнікоў асобных сацыяльных груп у розныя перыяды гісторыі. Разглядаецца спецыфіка рэканструкцыі і аналізу штодзённасці сельскіх дзяўчат. Прапанавана структурная кампазіцыя для даследавання адзначанай праблемы. Паказана эўрыстычная значнасць вывучэння дзявочай штодзённасці ў этналагічным кантэксце, адзначана яго рэпрэзентатыўнасць для разумення асобных аспектаў беларускай сялянскай культуры. Падкрэсліваецца значнасць выкарыстання вусных і візуальных крыніц, эгадакументаў для гістарычнай інтэрпрэтацыі чалавечай суб'ектыўнасці.*

***Ключавыя словы:*** *штодзённасць, дзявочая штодзённасць, даследаванне штодзённасці, беларуская этналогія, заходнепалеская вёска, сельскія дзяўчаты, вусныя крыніцы, фотакрыніцы.*

## *Everyday Life of Rural Girls of Western Polesie in the 20s-80s of the XX Century as a Research Problem*

*The article is devoted to understanding the everyday life of rural girls of Western Polesie in the 20s-80s of the twentieth century as a research problem. The place in the modern Belarusian scientific discourse of studies of everyday life and the history of girls' everyday life is determined. There is an interest in the history of everyday life among Belarusian scientists. But there are no comprehensive studies on the everyday practices of individual social groups. The specifics of reconstruction and analysis of everyday life of rural girls are considered. A structural composition is proposed for the study of the intended problem. The heuristic significance of studying girls' everyday life in an ethnological context is noted, its representativeness for understanding certain aspects of Belarusian peasant culture is noted. The author emphasizes the importance of using oral and visual sources, ego documents for the historical interpretation of human subjectivity.*

***Key words:*** *everyday life, girlish everyday life, study of everyday life, Belarusian ethnology, Western Polesie village, rural girls, oral sources, Photo sources.*

## Уводзіны

Пачынаючы з другой паловы ХХ ст. у навуковым асяроддзі актуалізавалася гуманістычная тэндэнцыя (антрапалагічны вектар), якая зрушыла цэнтр аналізу сацыяльнай рэальнасці з макра- на мікраўзровень. Вынікам «гісторыка-антрапалагічнага павароту» ў гуманітарнай думцы стала з'яўлен не новага даследчага накірунку – гісторыі штодзённасці. Штодзённы свет быў уключаны ў сферу навуковых даследаванняў гісторыкаў, этнолагаў, культуролагаў, сацыёлагаў, філосафаў. Пад пільную ўвагу пачалі трапляць практыкі паўсядзённага жыцця «малых» сацыяльных груп, «звычайных» людзей. Гісторыкі штодзённасці пачалі займацца вывучэннем «маленькіх людзей з іх вялікімі клопатамі». З'яўленне гэтага напрамку даследавання абумовіла вяртанне індывідуальнага і суб'ектыўнага ў гістарыяграфію [1, с. 74–75]. Пачалося пераасэнсаванне сацыяльнай рэальнасці сучаснай гуманітарыстыкай, пры якім штодзённасць пачала разглядацца не як кантэкст, дыскурс, фон, а ў якасці самастойнага прадмету

*Навуковы кіраўнік – Тадэвуш Антонавіч Навагродскі, доктар гістарычных навук, прафесар, загадчык кафедры этналогіі, музеялогіі і гісторыі мастацтваў Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта*

даследавання. Гэта прывяло да неабходнасці аналізу штодзённасці ва ўсёй разнастайнасці і цэласнасці, распрацоўкі падыходаў да яе разумення.

Мэта артыкула – асэнсаванне эўрыстычнай значнасці вывучэння штодзённага жыцця сельскіх дзяўчат Заходняга Палесся ў 20–80-я гг. XX ст.

Для дасягнення мэты пастаўлены наступныя задачы:

1) вызначыць месца даследаванняў гісторыі дзявочай штодзённасці ў сучасным беларускім навуковым дыскурсе даследаванняў гісторыі дзявочай штодзённасці;

2) разгледзець спецыфіку аналізу сельскай штодзённасці заходнепалескіх дзяўчат;

3) даць ацэнку рэпрэзентатыўнасці даследавання дзявочай штодзённасці для разумення беларускай народнай культуры.

**Тэарэтычныя падыходы да разумення штодзённасці. Беларуская гістарыяграфія дзявочай штодзённасці**

Пачатак усебаковага навукова-тэарэтычнага абгрунтавання гісторыі штодзённасці быў пакладзены заходнееўрапейскай гістарыяграфіяй. Інстытуцыялізацыя гісторыі штодзённасці як напрамку даследавання адбылася ў канцы 1970-х гг. перш за ўсё ў Францыі, Германіі, Аўстрыі. Шырока вядомымі і найчасцей апорнымі для асэнсавання штодзённасці з'яўляюцца трактоўкі Ф. Брадэля, Э. Гусэрля, А. Шуца. Э. Гусэрль адзін з першых звярнуў увагу на значнасць культуралагічнага асэнсавання «сферы чалавечай штодзённасці», якую ён назваў «жыццёвым светам». «Жыццёвы свет» – найбольш блізкі план жыцця, у якім навакольны свет для асобы характарызуецца штодзённасцю і прадметнасцю [2, с. 53]. Значным падыходам для трактоўкі штодзённасці з'яўляецца сацыялагічная тэорыя А. Шуца, які сфармуляваў тэзіс аб «множнасці рэальнасцяў», у якіх існуе чалавек. Па А. Шуцу, штодзённасць вызначаецца як «вярхоўная рэальнасць» сярод шэрагу іншых «светаў»: свету навуковай тэорыі, гульні, фантазіі, мастацтва, сну, паколькі толькі ў штодзённасць чалавек пагружаны цалкам у адрозненне ад іншых «светаў», дзе ён удзельнічае часткова. Штодзённасць, на думку даследчыка, звязана з дзейнай прыродай чалавека і яго асобаснай датычнасцю да свету сацыяльнага дзеяння і камунікацыі [3]. Не менш карыснымі для разумення і інтэрпрэтацыі штодзённасці з'яўляюцца тэарэтычныя распрацоўкі Ф. Бродэля адносна неаднароднасці часовых рытмаў і разнастайных сацыяльна-гістарычных працягласцей [4, с. 39]. Згодна бродэлеўскім вынікам, дынаміку чалавечага жыцця ў поўным аб'ёме можна ўбачыць, разглядаючы яе праз аспекты ўнутры «запаволенай» гісторыі, якая вымяраецца «сацыяльным» часам. Культуру штодзённасці даследчык разглядаў як аснову агульнай культуры. У шматлікіх тэарэтычных распрацоўках навукоўцы прывялі доказы пра асаблівы статус штодзённасці як асобнай суверэннай рэальнасці ў жыцці чалавека, якая заслугоўвае спецыяльнага вывучэння.

У інтэрпрэтацыі маюць патрэбу дэфініцыі «штодзённасць», «дзявочая штодзённасць», і, канешне, па-за ўвагай не можа застацца праблема крыніц па гісторыі дзявочай штодзённасці. Апорным для нас з'яўляецца вызначэнне паняцця «штодзённасць», якое прапанавала расійская даследчыца Г. Бялова. На яе думку, штодзённасць – гэта «жыццёвы кантынуум, бесперапыннасць досведаў, практык, успрыманняў, а галоўнае – перажыванняў, праз якія рэалізуецца суб'ектыўнасць». Пад «жаночай штодзённасцю» (дзявочая штодзённасць разглядалася Г. В. Бяловай у кантэксце жаночай) разумеюцца спосабы пражывання і перажывання ўсіх разнавіднасцяў, формаў, сфер і праяў неінстытуцыяналізаванага жаночага вопыту (як атрэфлексаванага, так і ментальнага, вербальнага і цялеснага, эмацыйнага, культурна-сімвалічнага, гаспадарчага, рэлігійнага, сэксуальнага і інш.) [5, с. 27–28]. Немалаважна засвоіць, што ключавымі рысамі, якія характарызуюць штодзённасць, з'яўляюцца *паўтаральнасць* і *доўгачасовасць*. Гэта падзеі, якія здзяйсняюцца пастаянна і на працяглы час затрымліваюцца ў сваёй аднатыпнасці. Але і гэта працягласць перажывае змены, нягледзячы на тое, што ажыццяўляюцца яны вельмі павольна [1, с. 78]. Прадметам вывучэння гісторыі штодзённасці з'яўляецца сфера чалавечай штодзённасці ў гісторыка-культурных, палітыка-падзейных, этнічных і канфесійных кантэкстах. Ключавым у вызначэнні «паўсядзённага» з'яўляецца звыклае, тое, што рэгулярна паўтараецца, што канструюе лад жыцця чалавека, уключаючы яго матывы паводзін і эмацый-

ныя рэакцыі на жыццёвыя падзеі [6]. Такім чынам, штодзённасць чалавека – гэта яго вопыт, рэалізаваны праз пэўныя дзеянні, грунтам для якіх выступае комплекс ведаў, поглядаў, каштоўнасцяў.

Пачынаючы з апошняга дзесяцігоддзя XX ст. рэцэпцыя заходніх канцэпцый «гісторыі штодзённасці» пачалася ў расійскай, украінскай і беларускай гістарыяграфіі. Змена даследчай парадыгмы прывяла да паступовага ўкаранення новых метадаў, пашырэння праблематыкі даследавання і ў айчыннай гуманітарыстыцы. Калі даваць ацэнку месца даследаванняў штодзённага жыцця і гісторыі штодзённасці дзяўчат у сучасным беларускім навуковым дыскурсе, то нельга казаць пра яго трывалую замацаванасць. Гэта можна абгрунтаваць наступным чынам: відавочнасць міждысцыплінарнага характару даследаванняў штодзённасці ўнесла пэўную блытаніну ў вызначэнні прадмету, тэарэтычна-метадалагічнага абгрунтавання, падборкі крыніц даследавання. Разам з тым назіраецца ўзрост цікавасці да вызначаных пытанняў. Па праблеме публікуюцца манаграфіі [7], спецыяльныя зборнікі артыкулаў [8–10], выдаюцца адмысловыя нумары часопісаў [11], распрацоўваюцца адпаведныя спецкурсы і вучэбныя праграмы для навучальных устаноў [12; 13].

Аб зацікаўленасці таксама сведчыць павелічэнне колькасці публікацый, якія даследуюць тыя ці іншыя аспекты паўсядзённага вопыту розных пластоў і катэгорый беларускага грамадства (традыцыйнага, савецкага, сучаснага). Папулярнымі на вызначанай даследчай ніве з’яўляюцца працы, прысвечаныя асобным аспектам «штодзённасці»: касцюм, традыцыі харчавання, побыт, культурнае жыццё (Л. В. Ракава, В. М. Бялявіна, Т. А. Наўгародскі, Т. В. Валодзіна і інш.). Значная ўвага надаецца вывучэнню штодзённых практык прадстаўнікоў канкрэтных сацыяўзроставых катэгорый, але трэба сказаць пра адсутнасць у гэтай галіне комплексных дасдедаванняў. Выключэннем у гэтай сувязі з’яўляецца вывучэнне праблемы трансфармацыі статуса беларускай сельскай жанчыны ў XX – пачатку XXI ст. І. В. Раманенка [14].

Адметнасцю навуковых прац па гэтай праблематыцы з’яўляецца міждысцылінарная «памежнасць» «паўсядзённазнаўчых» даследаванняў з гісторыяй [15], гісторыяй жанчын [16–18], літаратурай [19; 20], этналогіяй [21–24], семіётыкай [25; 26]. У публікацыях айчынных даследчыкаў рэканструююцца асобныя рэаліі штодзённасці, у тым ліку жанчын, моладзі, дзяцей пераважна з сялянскага асяроддзя. «Сялянская тэматыка» заўсёды была цэнтральнай у гісторыка-этналагічных даследаваннях, паколькі менавіта сялянства лічыцца носьбітам нацыянальнай культурнай традыцыі. А гісторыя штодзённага жыцця сялянскіх дзяўчат, спарадычна адлюстраваная ў гэтых працах, уяўляе сур’ёзную даследчую праблему і патрабуе спецыяльнай інтэрпрэтацыі.

У дадзеным артыкуле засяродзімся на разглядзе *штодзённага жыцця сельскіх дзяўчат Заходняга Палесся ў 1920-я – 1980-я гг.*

**Дзявочая штодзённасць як даследчая праблема: актуальнасць, спецыфіка аналізу і інтэрпрэтацыі**

У канкрэтную культурна-гістарычную эпоху чалавечая штодзённасць была абумоўлена ўстойлівасцю поглядаў, цыклічнасцю дзеянняў, якія выяўляліся праз пэўны лад жыцця, асаблівасці побыту, формы вольнага часу і камунікацыі, якія, у сваю чаргу, фарміравалі пэўны светапогляд (сістэму ідэалаў, установак, каштоўнасных арыентацый). Для кожнай гістарычнай эпохі быў рэлевантны спецыфічны сацыякультурны фон, які час ад часу зведваў трансфармацыі. Прадстаўнікі асобных сацыяльных груп, канфесій, гендарных і ўзроставых катэгорый па-рознаму ўспрымалі гэтыя змены. Як адзначыла даслечыца Г. В. Бялова, «кожная сацыяльная страта мае патрэбу ў спецыяльнай рэканструкцыі асабістага, як правіла, унутрана дыферэнцыраванага, штодзённага вопыта, “прачытанага” ў гендарным аспекце» [27].

Кажучы пра штодзённасць, у дадзеным выпадку пра выразна вызначаную «дзявочую штодзённасць», мы не можам разглядаць яе як гамагенны, універсальны, маналітны канструкт. Штодзённасць кожнага чалавека ў зададзеных прасторава-часавых абставінах суб’ектыўна і структурна неаднародная. У першую чаргу трэба вызначыцца з «локусам» штодзённасці, які будзе вывучацца: сельскі – гарадскі, савецкі – постсавецкі, традыцыйны – мадэрны.

У розныя гістарычныя кантэксты складваліся пэўныя (адносна стабільныя і

ўстойлівыя) сацыяльныя прасторы, асабліва гэта тычылася вёскі. Напрыклад, для традыцыйнай вёскі былі актуальны прыкладна аднолькавыя патэрны паводзінаў і мыслення, якія ўзнаўляліся ў наступных пакаленнях. Калі даследчы аб'ект мы абмяжуем тэрытарыяльна, прасторава-часава, сацыяльна, мы зможам акрэсліць фактары, якія вызначалі і канструявалі штодзённую прастору канкрэтнай вёскі альбо горада. У такім выпадку «штодзённасць» можна разглядаць як тыпізаваны свет сацыяльных дзеянняў і камунікацыі, дзе чалавек мае справу са звыклымі формамі дачыненняў, якія карэлююцца з канкрэтным сацыякультурным кодам.

Штодзённы свет дзяўчыны інтэрсуб'ектыўны і сацыяльна структураваны, і таму немагчыма даследаваць дзяўчат ізалявана. Прадметызацыя «дзяўчат» зусім не азначае, што пытанні, напрыклад, пра хлопцаў выключаны з разгляду. Як адзначыла М. Мід, «і мужчыны і жанчыны набываюць форму за кошт прысутнасці і паводзін абодвух палоў, кожны пол залежыць ад узаемадзеяння з іншым» [28, с. 335]. Адносіны з соцыўмам не могуць застацца па-за ўвагай. Акрамя калектыўных, даследаванне ўключае сферы індывідуальнага вопыту. Кажучы пра штодзённасць, мы маем на ўвазе розныя яе ўзроўні: матэрыяльны, ментальны, сацыяльны. Перспектыва вывучэння штодзённасці заходнепалескіх дзяўчат, на наш погляд, заключаецца ў супастаўленні гэтых узроўняў: матэрыяльных форм існавання, ментальнага свету і сацыяльнага жыцця.

Вывучэнне штодзённасці прадугледжвае наданне ўвагі ўмовам, прадыктаваным чалавеку навакольным асяроддзем і культурай, якія «змушалі» яго пражываць сваё жыццё пэўным чынам, пэўнымі «структурамі штодзённасці». Каб палегчыць шлях па рэканструкцыі праблемы, вызначым гэтыя «структуры». У працы «Традиционная белорусская деревня в европейской перспективе» даследчык В. Я. Насевіч разглядаў традыцыйную культуру з пункту гледжання сістэмнага падыходу і вылучыў яе асноўныя структурныя часткі [29, с. 13–15]. Абапіраючыся на пазіцыю В. Я. Насевіча, паспрабуем структурна акрэсліць дзявочую штодзённасць. Сярод складнікавых элементаў мы вылучылі наступныя.

1. Сацыяльнае становішча (сямейнае і грамадскае): адносіны вяршэнства – падпарадкавання, размеркаванне правоў (у тым ліку маёмасных) і абавязкаў, гендэрных роляў паміж членамі грамадства, міжпакаленная сувязь.

2. Прававое становішча (прававая культура, крыніцы права).

3. Побытавая культура (арганізацыі жылля, «рэчавы свет», традыцыі харчавання, мода і касцюм).

4. Выхаванне і сацыялізацыя (крыніцы, сродкі і формы педагагічных практык).

5. Адукацыя (крыніцы, сродкі і формы адукацыйных практык).

6. Праца: гаспадарчыя абавязкі (комплекс заняткаў, які забяспечвае гадавы земляробчы цыкл) і вытворчасць (атрыманне з навакольнага асяроддзя матэрыяльных рэсурсаў, неабходных для падтрымання жыцця, іх апрацоўка і захоўванне).

7. Ахова здароўя (сродкі гігіены, практыкі лекавання).

8. Вольны час (каммунікатыўныя практыкі, забавы).

9. Духоўнае жыццё (рэлігійныя ўяўленні, светапоглядная мадэль, этычныя і эстэтычныя ўяўленні і ідэалы).

10. Сэксуальная культура (шлюбныя паводзіны: шлюбны ўзрост, дашлюбныя адносіны, выбар партнёра; формы дэвіяцыі: аборты, пазашлюбная нараджальнасць, прастытуцыя).

11. Фальклор (узаемаўплыў штодзённасці і фальклору).

Актуальнасць даследавання штодзённасці выклікана пераўтварэннямі грамадскага жыцця: эканамічнага, палітычнага, духоўнага, прававога, якія знутры змянялі яе структурную арганізацыю. Храналагічнымі межамі гэтай праблемы з'яўляецца савецкі перыяд (1920–1980-я гг.), які для заходнепалескай вёскі не быў у поўнай меры «савецкім». Разгляд штодзённасці гэтага перыяду цікавы тым, што ў гэты прамежак часу штодзённасць была месцам перакрыжавання традыцый і навацый, іх канфліктаў і прыстасаванняў. У сацыякультурных рэаліях Заходняга Палесся 1920–1950-х гг. пласт традыцыйнай культуры амаль не быў ахоплены мадэрнізацыяй. Саветызацыя рэгіёну пачалася пасля вайны і азначала яго культурнае аднаўленне, у выніку чаго канструяваўся новы сацыяльны парадак з новымі камунікацыйнымі і культурнымі практыкамі, з новымі суб'ектыўнасцямі і ідэнтычнасцямі.

Захаваны, а пазней трансфармаваны традыцыйны аспект вясковай культуры вызначаў штодзённае жыццё сялянак. Гэтыя працэсы, на наш погляд, маюць патрэбу ў аналітычным асэнсаванні. «Ні адна праблема макраўзроўню не можа быць эфектыўна вырашана, пакуль яна не будзе разгледжана з пункту гледжання мікрасацыяльных адносін, у прыватнасці, у плоскасці штодзённасці, дзе фармуюцца механізмы чалавечых дачыненняў і ўзаемадзеянняў» [30, с. 4].

Чым цікава этналагічнае вывучэнне дзявочай штодзённасці?

1. Дзяўчына з дзяцінства да сталасці не мела паўнавартаснай сацыяльнай суб’ектнасці. Яна была аб’ектам выхавання і сацыялізацыі і разам з тым практыкавала працоўныя, выхаваўчыя, культурныя навыкі, паколькі дапамагала маці даглядаць маленькіх дзяцей (прычым абодвух палоў). Набываючы статус маці, яна паўстае ўжо як суб’ект, які транслюе набытыя і сфарміраваныя ў ёй (бацькамі і грамадствам) каштоўнасці і погляды.

2. Дзявоцтва – перыяд у жыцці жанчыны найбольш насычаны камунікатыўнымі, культурнымі практыкамі, асабліва ў кантэкце традыцыйнай культуры. У гэтай сувязі дзяўчына з’яўлялася значным актарам у сацыякультурным жыцці вёскі.

3. Нягледзячы на ўласцівую традыцыйнай вёсцы патрыярхальнасць і іерархічнасць, складаліся абставіны, пры якіх сялянская дзяўчына як у сям’і, так і ў межах грамады займала даволі актыўную пазіцыю. Гістарычныя перыпетыі XX ст. вымушалі жанчын і дзяўчат выконваць ролю галоўнай, «старэйшай», ролю гаспадара. Прычынай таму маглі стаць розныя акалічнасці аб’ектыўнага і суб’ектыўнага характару: напрыклад, адсутнасць мужчыны ў сям’і (хвароба бацькі, адсутнасць братоў, смерць на фронце, сіроцтва) альбо яго доўгае знаходжанне па-за гаспадарчым дваром (праца ў іншай, далёкай мясцовасці, заробкі, ваенная служба і фронт). Так, у непрадбачаных экстраных сітуацыях і абставінах, якія парушалі палавую дыферэнцыю сям’і, дзяўчаты выконвалі мужчынскія кіруючыя паўсядзённыя ролі і абавязкі. Разгляд гэтых, здавалася б, «пасрэдных» жыццёвых практык праз прызму «лёсаў», «галасоў» канкрэтных жанчын, дазваляе нам па-іншаму паглядзець на гісторыю, пачуць яе новае, нязвыклае «гучанне».

4. Значным фактам з’яўляецца тое, што дзяўчаты – прадстаўнікі моладзі. Менавіта маладое пакаленне, як найбольш мабільнае і схільнае да паглынання наваўвядзін, імкліва пераймала нетыповыя для вёскі стандарты светаўспрымання. Таму на прыкладзе разгляду штодзённасці дзявочай суполкі цікава прасачыць за трансфармацыйнымі зрухамі ў культуры.

Для даследавання штодзённасці сутнасную ролю адыгрывае сацыялагічны метад інтэрв’ю (вусныя крыніцы), а таксама візуальныя крыніцы (фотаздымкі, кінадакументы, музейныя артэфакты). Дылема даследавання штодзённасці з дапамогай эгадакументаў, вусных крыніц, фотаматэрыялаў заключаецца ў тым, што ілюстрацыі на ўзроўні адзінкавых фактаў наглядныя і зразумелыя, але іх «тыповасць» недаказальная. Мы, безумоўна, згодны з тым, што нельга экстрапаляваць вынікі, атрыманыя з асабістых крыніц групы людзей, на ўвесь матэрыял, які вывучаецца. Але ў той жа час вусныя крыніцы, фатаграфіі не пазбаўлены нагляднасці і «чалавечага вымярэння». Менавіта праз «нетрадыцыйныя» крыніцы мы можам трансляваць гэтую суб’ектыўную артыкуляцыю сябе і свайго жыцця, прыватнасць, стракатасць «галасоў», унікальнасць біяграфічнага вопыту. «Складана вывучаць штодзённасць, калі не бачыць у гэтым адзін са спосабаў гістарычнай інтэрпрэтацыі чалавечай суб’ектыўнасці ва ўсіх разнастайных яе праявах, не прызнаваць значнасці многіх суб’ектыўнасцяў у рэалізацыі гістарычнага мінулага, якое скдадаецца з мноства асобных жыццёвых рэальнасцяў канкрэтных жанчын і мужчын, іх штодзённых практык і досведаў» [31, с. 40]. Успаміны – гэта «адлюстраванне памяці групы (сацыяльнай, этнічнай), прадстаўніком якой пазіцыянуе сябе аўтар, і могуць служыць крыніцай па даследаванні гэтых груп» [32, с. 232].

**Заключэнне**

1. Штодзённае жыццё сельскіх дзяўчат у беларускай навуцы не было прадметам спецыяльнага гісторыка-этналагічнага, культуралагічнага даследавання. Дзявоцкая паўсядзённасць, на наш погляд, можа быць паўнавартасным прадметам у полі міждысцыплінарнага даследавання. Бачыцца неаб-

ходнасць у правядзенні сістэмнага навуковага аналізу, у якім «дзявочы свет» трэба разглядаць як жыццёвы кантынуум, бесперапыннасць досведаў, практык, успрыманняў і перажыванняў. Вывучэнне дзявочай штодзённасці як спосабу гістарычнай інтэрпрэтацыі чалавечай суб'ектыўнасці ва ўсіх шматлікіх яе праявах можна разглядаць у якасці прыкладу перахода да антрапалагізаванай гендэрна адчувальнай сацыяльнай гісторыі.

2. Рэканструкцыю штодзённага жыцця чалавека (практык, роляў, свядомасці, паводзінаў) немагчыма праводзіць без апоры на яго ацэнкі, пункты гледжання, пачуццёвыя і эмацыйныя праявы. Выкарыстанне вусных успамінаў дае падставу зразумець, як жанчыны артыкулююць сябе, свой вопыт, пэўныя гісторыка-культурныя працэсы праз успаміны. Атрыманыя ў выніку інтэрв'ю эмацыйна насычаныя звесткі адыгрываюць важную ролю ў рэканструкцыі гісторыі і культуры Заходняга Палесся, якая сыходзіць у мінулае. Выкарыстанне ў тэксце цытат з захаванымі індывідуальнымі моўнымі асаблівасцямі інфарманта дазваляе успрымаць вопыт сацыяльнай групы праз асабісты вопыт яе прадстаўніка. Вусная гісторыя, фальклор, фотадакументы паказваюць лёсы людзей, канкрэтных мужчын і жанчын, якія можа не здзейснілі подзвігаў, надзвычайных учынкаў, але таксама перажылі асабісты вопыт, унікальны досвед, людзей, чыя памяць – складаная частка калектыўнай гістарычнай памяці.

3. Аналіз штодзённага жыцця дзяўчат з'яўляецца рэпрэзентатыўным для разумення асобных аспектаў беларускай сялянскай культуры. Разгляд дзявочай штодзённасці дазваляе прасачыць дынаміку этнакультурных працэсаў у беларускім грамадстве ў залежнасці не столькі ад знешніх макразменаў (грамадска-плітычных, сацыяльна-эканамічных, культурных), колькі ад унутраных трансфармацый дзявочай ментальнасці і ўласна дзявочага этаса. Прызнанне за гісторыяй паўсядзённасці патэнцыялу эфектыўнай пазнавальнай стратэгіі дае магчымасць новага тлумачэння гісторыі. Рэканструкцыя свету штодзённасці спрыяе аднаўленню вобраза культуры ў цэлым, культурных светаў асобных сацыяльных груп і слаёў, прынцыпаў іх узаемадзеяння ў рамках адзінай культурна-кодавай прасторы, фарміравання ўяўленняў адзін пра аднаго і пра сябе.

## СПІС ВЫКАРЫСТАНАЙ ЛІТАРАТУРЫ


1. Пандель, Г.-Ю. Повседневная история как новый жанр историографии / Г.-Ю. Пандель // Гісторыя штодзённасці і правы чалавека : матэрыялы Міжнар. канф., Мінск, 1–5 снеж. 1999 г. / уклад. П. Садоўскі, М. Тэлюс. – Минск : Тэхналогія, 2000. – С. 73–78.

2. Камоцкий, М. В. Повседневность сельской молодежи: социально-культурный аспект / М. В. Камоцкий // Проблемы упр. – 2015. – № 4. – С. 53–57.

3. Шюц, А. О множественности реальностей / А. Шюц // Социол. обозрение. – 2003. – Т. 3, № 2. – С. 3–34.

4. Бродель, Ф. Материальная цивилизация, экономика и капитализм, XV–XVIII вв. : в 3 т. / Ф. Бродель. – М. : Весь мир, 2006. – Т. 1 : Структуры повседневности: возможное и невозможное. – 592 с.

5. Белова, А. В. Повседневная жизнь провинциальной дворянки Центральной России (XVIII – середина XIX в.) : автореф. дис. … д-ра ист. наук : 07.00.07 / А. В. Белова. – М., 2009. – 66 с.

6. Пушкарева, Н. Л. «История повседневности» как направление исторических исследований [Электронный ресурс] / Н. Л. Пушкарева. – Режим доступа: https://www.perspektivy.info/-print.php?ID=50280. – Дата доступа: 11.05.2022.

7. Іванова, В. С. Ліпляны. Біяграфія і штодзённасць беларускай вёскі / В. С. Іванова. – Мінск : Галіяфы, 2019. – 403 с.

8. Социкультурная жизнь: история повседневности : сб. материалов регион. науч.-практ. конф., Брест, 27 нояб. 2015 г. / Брест. гос. ун-т им. А. С. Пушкина ; редкол.: Т. М. Тохиян, Е. С. Розенблат. – Брест : БрГУ, 2016. – 168 с.

9. Социокультурная жизнь в XX–XXI вв.: история повседневности : материалы межуниверситет. студенч. науч.-практ. конф., Брест, 7 апр. 2010 г. / под общ. ред. Т. М. Тохиян. – Брест : Альтернатива, 2010. – 109 с.

10. Гісторыя штодзённасці і правы чалавека : матэрыялы Міжнар. канф., Мінск, 1–5 снеж. 1999 г. / уклад.: П. Садоўскі, М. Тэлюс. – Мінск : Тэхналогія, 2000. – 276 с.

11. Гісторыя беларускай штодзённасці : зб. арт. / гал. рэд. В. Булгакаў. – Мінск : Рэд. часоп. «Архэ-Пачатак», 2012. – 309 с.

12. Бурак, Т. В. Социология повседневности [Электронный ресурс] : пособие / Т. В. Бурак. – Режим доступа: https//:elib.bsu.by/handle/123456789/104288. – Дата доступа: 06.05.2022.

13. Лебедев, А. Д. История повседневности сельского населения Беларуси в XX веке : учеб. программа / А. Д. Лебедев. – Гомель : ГГУ им. Ф. Скорины, 2018. – 14 с.

14. Романенко, И. В. Трансформация статуса белорусской сельской женщины в XX – начале XXI века / И. В. Романенко. – Минск : Беларус. навука, 2015. – 201 с.

15. Kashtalian, I. The repressive factors of the USSR's internal policy and everyday life of the Belarusian society (1944–1953) / I. Kashtalian. – Wiesbaden : Harrassowitz, 2016. – 345 p.

16. Нікалаева, І. У. Жанчыны Беларусі ў перыяд германскай акупацыі (1941–1944 гг.) : дыс. ... канд. гіст. навук : 07.00.02 / І. У. Нікалаева. – Витебск, 2006. – 140 л.

17. Дулов, А. Н. Женщины Советской Беларуси в общественно-политической жизни и материальном производстве (20-е годы XX века) : дис. ... канд. ист. наук : 07.00.02 / А. Н. Дулов. – Витебск, 2006. – 122 л.

18. Гардзіенка, Н. С. Становішча жанчыны-шляхцянкі ў Вялікім Княстве Літоўскім у XVIII ст. : аўтарэф. дыс. … канд. гіст. навук : 07.00.02 / Н. С. Гардзіенка. – Мінск, 2003. – 20 с.

19. Савошчанка, Г. Р. Жанчыны Палесся : зб. апавяданняў / Г. Р. Савошчанка. – Мінск : Каўчэг, 2018. – 165 с.

20. Алексиевич, С. У войны не женское лицо / С. Алексиевич. – М. : Время, 2016. – 347 с.

21. Калачова, І. І. Мужчынскае і жаночае ў традыцыйнай культуры беларусаў / І. І. Калачова. – Мінск : Беларус. навука, 2019. – 165 с.

22. Якубінская, А. Д. Традыцыйныя спосабы і сродкі сацыялізацыі дзяцей у беларускіх сялян у другой палове XIX – першай палове XX стагоддзяў : аўтарэф. дыс. ... канд. гіст. навук : 07.00.07 / А. Д. Якубінская ; Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К. Крапівы. – Мінск, 2009. – 22 с.

23. Чарнякевіч, І. С. Дзеці ў заходнепалескай вясковай сям'і ў міжваенны перыяд / І. С. Чарнякевіч // Актуальные вопросы медицины : материалы науч.-практ. конф., посвящ. 65-летию УЗ «Городская клиническая больница № 2 г. Гродно», Гродно, 30 окт. 2009 г. / редкол.: В. И. Шишко (отв. ред.) [и др.]. – Гродно, 2009. – С. 206–208.

24. Чарнякевіч, І. С. Жыццёвыя перспектывы палескай вясковай моладзі ў II Рэчы Паспалітай / І. С. Чарнякевіч // Народы, культуры и социальные процессы на пограничье : материалы Междунар. науч.-практ. конф., Гродно, 22–23 февр. 2010 г. / редкол.: Е. М. Бабосов (отв. ред.) [и др.]. – Гродно, 2010. – С. 314–317.

25. Валодзіна, Т. Цела чалавека: слова, міф, рытуал / Т. Валодзіна. – Мінск : Тэхналогія, 2009. – 423 с.

26. Швед, І. А. Космас і чалавек у дэндралагічным кодзе беларускага фальклору : манаграфія / І. А. Швед. – Брэст : БрДУ, 2006. – 129 с.

27. Белова, А. В. Повседневная жизнь русской провинциальной дворянки конца XVIII – первой половины XIX века как проблема исследования [Электронный ресурс] / А. В. Белова. – Режим доступа: https://cyberleninka.ru/article/n/povsednevnaya-zhizn-russkoy-provintsialnoy-dvoryanki-kontsa-xviii-pervoy-poloviny-xix-veka-kak-problema-issledovaniya. – Дата доступа: 18.05.2022.

28. Мид, М. Мужское и женское. Исследование полового вопроса в меняющемся мире : пер. с англ. / М. Мид. – М. : Прогресс-Традиция, 2004. – 412 с.

29. Носевич, В. Л. Традиционная белорусская деревня в европейской перспективе / В. Л. Носевич. – Минск : Тэхналогія, 2004. – 350 с.

30. Полякова И. П. Повседневность в социально-философском контексте: теоретико-методологический анализ [Электронный ресурс] / И. П. Полякова. – Режим доступа:

https://www.dissercat.com/content/povsednevnost-v-sotsialno-filosofskom-kontekste-teoretiko-metodologicheskii-analiz. – Дата доступа: 27.01.2022.

31. Белова, А. В. Концепт «женская повседневность» в контексте истории повседневности: гендерная чувствительность новой социальной истории / А. В. Белова // Гендер в фокусе антропологии, этнографии семьи и социальной истории повседневности. – М. : ИЭА РАН, 2019. – С. 39–48.

32. Чарнякевіч, І. С. Версія мінулага вачамі палескага жыхара, прачытаная яго ўнучкай / І. С. Чарнякевіч // Tożsamość – język – rodzina : z badań na pograniczu słowiańsko-bałtyckim : zbiór art. ; red. A. Engelkind. – Warszawa : Slawistyczny OśrodekWydawniczy, 2008. – S. 217–232.

REFERENCES

1. Pandel’, H.-Yu. Povsiednievnaja istorija kak novyj zhanr istoriografii / H.-Yu. Pandel’ // Historyja shtodzionnasci i pravy chalavieka : materyjaly Mizhnar. kanf., Minsk 1–5 sniezh. 1999 h. / uklad. P. Sadouski, M. Telius’. – Minsk : Tekhnalohija, 2000. – S. 73–78.

2. Kamockij, M. V. Povsiednievnost’ siel’skoj molodiozhi: social’no-kul’turnyj aspiekt / M. V. Kamockij // Probliemy upr. – 2015. – № 4. – S. 53–57.

3. Shiuc, A. O mnozhestviennosti rieal’nostiej / A. Shiuc // Sociol. obozrienije. – 2003. – T. 3, № 2. – S. 3–34.

4. Brodel’, F. Matierial’naja civilizacija, ekonomika i kapitalizm, XV–XVIII vv. : v 3 t. / F. Brodel’. – M. : Vies’ mir, 2006. – T. 1 : Struktury povsiednievnosti: vozmozhnoje i nievozmozhnoje. – 592 s.

5. Bielova, A. V. Povsiednievnaja zhizn’ provincial’noj dvorianki Central’noj Rossii (XVIII – sieriedina XIX v.) : avtorief. dis. … d-ra ist. nauk : 07.00.07 / A. V. Bielova. – M., 2009. – 66 s.

6. Pushkariova, N. L. «Istorija povsiednievnosti» kak napravlienije istorichieskikh issliedovanij [Eleiktronnyj riesurs] / N. L. Pushkariova. – Riezhim dostupa: https://www.perspektivy.info/print.php?ID=50280. – Data dostupa: 11.05.2022.

7. Ivanova, V. S. Lipliany. Bijahrafija i shtodzionnasc’ bielaruskaj vioski / V. S. Ivanova. – Minsk : Halijafy, 2019. – 403 s.

8. Sociokul’turnaja zhizn’: istorija povsiednievnosti : sb. matierialov riegion. nauch.-prakt. konf., Briest, 27 nojab. 2015 g. / Briest, gos. un-t im. A. S. Pushkina ; riedkol.: T. M. Tokhijan, Ye. S. Rozenblat. – Briest : BrGU, 2016. – 168 s.

9. Sociokul’turnaja zhizn’ v XX–XXI vv.: istorija povsiednievnosti : matierialy miezhuniveirsitiet. studiench. nauch.-prakt. konf., Briest, 7 apr. 2010 g. / pod obshch. ried. T. M. Tokhijan. – Briest : Al’ternativa, 2010. – 109 s.

10. Historyja shtodzionnasci i pravy chalavieka : materyjaly Mizhnar. kanf., Minsk, 1–5 sniezh. 1999 g. / uklad.: P. Sadouski, M. Telius. – Minsk : Tekhnalohija, 2000. – 276 s.

11. Historyja bielaruskaj shtodzionnasci : zb. art. / hal. red. V. Bulhakau. – Minsk : Red. chasop. «Arkhe-Pachatak», 2012. – 309 s.

12. Burak, T. V. Sociologija povsiednievnosti [Eliektronnyj riesurs] : posobije / T. V. Burak. – Riezhim dostupa: https//:elib.bsu.by/handle/123456789/104288. – Data dostupa: 06.05.2022.

13. Liebiediev, A. D. Istorija povsiednievnosti siel’skogo nasielienija Bielarusi v XX viekie : uchieb. programma / A. D. Liebiediev. – Gomiel’ : GGU im. F. Skoriny, 2018. – 14 s.

14. Romanienko, I. V. Transformacija statusa bielorusskoj siel’skoj zhenshchiny v XX – nachalie XXI vieka / I. V. Romanienko. – Minsk : Bielarus. navuka, 2015. – 201 s.

15. Kashtalian, I. The repressive factors of the USSR’s internal policy and everyday life of the Belarusian society (1944–1953) / I. Kashtalian. – Wiesbaden : Harrassowitz, 2016. – 345 p.

16. Nikalajeva, I. U. Zanchyny Bielarusi u pieryjad hiermanskaj akupacyi (1941–1944 hh.) : dys. ... kand. hist. navuk : 07.00.02 / I. U. Nikalajeva. – Vitiebsk, 2006. – 140 l.

17. Dulov, A. N. Zenshchiny Sovietskoj Bielarusi v obshchiestvienno-politichieskoj zhizni i matierial’nom proizvodstvie (20-je gody XX vieka) : dis. ... kand. ist. nauk : 07.00.02 / A. N. Dulov. – Vitiebsk, 2006. – 122 l.

18. Hardzijenka, N. S. Stanovishcha zhanchyny-shliakhcianki u Vialikim Kniastvie Litouskim u XVIII st. : autaref. dys. … kand. hist. navuk : 07.00.02 / N. S. Hardzijenka. – Minsk, 2003. – 20 s.

19. Savoshchanka, H. R. Zanchyny Paliessia : zb. apaviadanniau / H. R. Savoshchanka. – Minsk : Kaucheh, 2018. – 165 s.

20. Alieksijevich, S. U vojny nie zhenskoje lico / S. Alieksijevich. – M. : Vriemia, 2016. – 347 s.

21. Kalachova, I. I. Muzhchynskaje i zhanochaje u tradycyjnaj kul'tury bielarusau / I. I. Kalachova. – Minsk : Bielarus. navuka, 2019. – 165 s.

22. Yakubinskaja, A. D. Tradycyjnyja sposaby i srodki sacyjalizacyi dziaciej u bielaruskikh sialian u druhoj palovie XIX – piershaj palovie XX stagoddziau : autaref. dys. … kand. hist. navuk : 07.00.07 / A. D. Yakubinskaja ; Nac. akad. navuk Bielarusi, In-t mastactvaznaustva, etnahrafii i fal'kloru imia K. Krapivy. – Minsk, 2009. – 22 s.

23. Charniakievich, I. S. Dzieci u zakhodniepalieskaj viaskovaj siamji u mizhvajenny pieryjad / I. S. Charniakievich // Aktual'nyje voprosy miediciny : matierialy nauch.-prakt. konf., posviashch. 65-lietiju UZ «Gorodskaja klinichieskaja bol'nica № 2 g. Grodno», Grodno, 30 okt. 2009 g. / riedkol.: V. I. Shishko (otv. ried.) [i dr.]. – Grodno, 2009. – S. 206–208.

24. Charniakievich, I. S. Zycciovyja pierspiektyvy palieskaj viaskovaj moladzi u II Rechy Paspalitaj / I. S. Charniakievich // Narody, kul'tury i social'nyje processy na pogranichje : matierialy Miezhdunar. nauch.-prakt. konf., Grodno, 22–23 fievr. 2010 g. / riedkol.: Ye. M. Babosov (otv. ried.) [i dr.]. – Grodno, 2010. – S. 314–317.

25. Valodzina, T. Ciela chalavieka: slova, mif, rytual / T. Valodzina. – Minsk : Tekhnalohija, 2009. – 423 s.

26. Shvied, I. A. Kosmas i chalaviek u dendralagichnym kodzie bielaruskaha fal'kloru : manahrafija / I. A. Shvied. – Brest : BrDU, 2006. – 129 s.

27. Bielova, A. V. Povsiednievnaja zhizn' russkoj provincial'noj dvorianki konca XVIII – piervoj poloviny XIX vieka kak probliema issliedovanija [Eliektronnyj riesurs] / A. V. Bielova. – Riezhim dostupa: https://cyberleninka.ru/article/n/povsednevnaya-zhizn-russkoy-provintsialnoy-dvoryanki-kontsa-xviii-pervoy-poloviny-xix-veka-kak-problema-issledovaniya. – Data dostupu: 27.01.2022.

28. Mid, M. Muzhskoje i zhenskoje. Issliedovanije polovogo voprosa v mieniajushchiemsia mire : pier. s angl. / M. Mid. – M. : Progress-Tradicija, 2004. – 412 s.

29. Nosievich, V. L. Tradicionnaja bielorusskaja dierievnia v jevropiejskoj pierspiektivie / V. L. Nosievich. – Minsk : Tekhnalohija, 2004. – 350 s.

30. Poliakova, I. P. Povsiednievnost' v social'no-filosofskom kontiekstie: tieorietiko-mietodologichieskij analiz [Eliektronnyj riesurs] / I. P. Poliakova. – Riezhim dostupa: https://www.dissercat.-com/content/povsednevnost-v-sotsialno-filosofskom-kontekste-teoretiko-metodologicheskii-analiz. – Data dostupa: 27.01.2022.

31. Bielova, A. V. Koncept «zhenskaja povsiednievnost'» v kontiekstie istorii povsiednievnosti: giendernaja chuvstvitiel'nost' novoj social'noj istorii / A. V. Bielova // Giender v fokusie antropologii, etnografii siem'ji i social'noj istorii povsiednievnosti. – M. : IEA RAN, 2019. – S. 39–48.

32. Charniakievich, I. S. Viersija minulaha vachami palieskaha zhykhara, prachytanaja jaho unuchkaj / I. S. Charniakievich // Tożsamość – język – rodzina : z badań na pograniczu słowiańsko-bałtyckim : zbiór art. ; red. A. Engelkind. – Warszawa : Slawistyczny OśrodekWydawniczy, 2008. – S. 217–232.

*Рукапіс паступіў у рэдакцыю 06.06.2022*